

Моя дочка очень добрая, набожная, музыкальная, но легко ранимая ввиду трудностей с учебой. Школьный психолог сказал, что она «правополушарная». Как оценить такой диагноз с религиозной точки зрения?

Светлана

# «ПАРУСІЯ»

*Парусія – з грэцкай мовы – Другое прыйсце Гасподняе, якое павінна адбыцца пры сканчэнні веку, калі князь гэтага свету раптоўна набудзе вялікую моц і статус, так што ніхто не зможа без яго загаду ці кляйна: «ні купляць, ні прадаваць» [Адкр 13, 18]. Нават многія верныя будуць пераможаныя гэтым злом, упэўненыя ў Антыхрысце як у божым сыне.

• **Рубрыку вядзе святар Яўген Маліноўскі, кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт**

Сучаснай школе няўцям, што, адыходзячы ад традыцыі "Вялікай дыдактыкі" (Я.А. Каменскі), заснаванай на слове Божым, яна ўсё больш нагадвае Божы суд, чым Яго валадарства. Прыгоднасць жа да апошняга вызначаецца не ўзроўнем адукацыі ці эрудыцыі, але «ўбогасцю духоўнай» [Мц 5]. «Кваліфікаваны» прысуд над дзіцем і яго бацькамі сурова папярэджвае Святое Пісанне : «Хай з вас многія не квапяцца быць настаўнікамі, браты мае, ведаючы, што тым цяжэйшы атрымаем прысуд. Бо ўсе мы шмат у чым грашым» [Як 3]. Тым не менш добра, калі суд ужо адбываецца. Вызначаючы адсутнасць матэрыяльнага поспеху ў ліхім свеце, ён стымулюе нашу асобу як прысутнасць Божую, альбо парусію.

Зыходзячы з сітуацыі, апісанай маці, магчыма меркаванне наяўнасці такіх асаблівасцей, якія выклікалі яе трывогу адвай меры ўлічваюць індывідуальныя асаблівасці дзяцей, якія яшчэ І.П. Паўлаў класіфікаваў на «чисто человеческие типы высшей нервной деятельности – мыслители, художники и средние». Відавочна, сучасная школа арыентавана больш на першых. Між тым напачатку мінулага стагоддзя выдатны псіхолаг і святар Васіль Зянькоўскі ў сваёй працы «Псіхалогія дзяцінства» падкрэсліваў, што «недаразвіццё псіхічных функцый дзіцяці не з'яўляецца прычынай, але вынікам яго своеасаблівасцей».

Сучасныя нейрапсіхалагічныя даследаванні паказалі, што правае і левае паўшар'і мозгу маюць спецыфічныя функцыі. Да 1960 года паўсюдна была прынята думка аб перавазе левага, «мыслящего», паўшар'я, кіруючага, як вядома, правай, пануючай, часткай цела. Яно лагічнае вербальнае здольінтуітыўнае, здольнае да ўсталявання прадметна-прасторавых сувязей, успрымае ўсе абставіны жыцця і смерці сымультанна, г.зн. адначасова. Нейралагічныя дадзеныя, па якіх няшчасныя выпадкі, удары, пухліны на левым паўшар'і звычайна замаруджваюць чытанне, пісьмо, мову, матэматычныя вылічэнні, прывялі да высновы левага паўшар'я як дамінуючага, галоўнага, а его маўклівага суседа справа як сціплага служкі. Медыцынска-фізіялагічнае тлумачэнне псіхікі чалавека ў пэўны ступені паўплывала на ўзнікненне навукова-атэістычнай гіпотэзы. «Бога нет, – узвясціў Астап Бендэр, – это медицинский факт!»

Памылковасць гэтай нікім не даказанай гіпотэзы відавочная праз рэлігійныя памкненні чалавека, якія з'яўляюцца псіхалагічным сілкаваннем для правапаўшарнага, «иррационального», мыслення, парушэнне функцый якога дыскрэдытуе вынікі «рацыянальнага» левага паўшар'я. Вынікам такой дыскрэдытацыі можна лічыць своечасовае паражэнне і скасаванне дакладана ўсіх "единственно верных" палітычных ідэалогій і рацыяльных дактрын.

Нобелеўскі лаўрэат амерыканскі псіхолаг Роджэр Спэры на падставе даследавання тысяч прыродных твараў, узнікненні рэлігійных пачуццяў. У той жа час творчыя памкненні правага паўшар'я кантралююцца і ўладкоўваюцца скрупулёзнай працай левага. Напрыклад, калі правае паўшар'е распазнае гукі і твары, дык левае іх называе і класіфікуе. Таму, дарэчы, праславутае «гэта я ўжо бачыў» адносіцца, відавочна, да падсвядомай сферы правага паўшар'я. Можна адмыслова ўявіць сабе суадносіны правага і левага паўшар'яў як метафару Усходу і Захаду: "на Усходзе жыве бесчалавечны бог, а на Захадзе бязбожны чалавек".

Вызначаныя характарыстыкі адпаведна тыпалагізуюць дачку нашай чытачкі як характэрнага прадстаўніка «правапаўшарнай» часткі чалавецтва. Небяспеку маці можна зразумець. Бо, як схільны лічыць некаторыя навукоўцы, традыцыйная сістэма адукацыі не здольна навучыць чамусьці правае паўшар'е. Дасканаленне творчай мадэлі асобы мусіць адбывацца на парытэтных асновах навукі, мастацтва, рэлігіі ў сувязі з узаемадзеяннем абодвух паўшар'яў: левае разумее словы і знаходзіць сэнс, называе гукі, музычную вышыню якіх пазнае правае, якое, дарэчы, ацэньвае гумар, фантазію, эстэтычны густ, спрыяе глыбіні перажыванняў і пачуццяў. Парэаграфіі – часта перашкаджае ўспрымаць хранялагічны парадак тэкстаў, картаў і схем. Замест гэтага ім даспадобы хаос бягучага часу, сузіранне вобразаў і шчырыя, нефармальныя зносіны з пагодкамі, бацькамі, настаўнікамі.

Можна параіць занепакоенай маці большага даверу сваёй дачцэ і «не перашкаджаць ўваходзіць дзіцяці ў царства Божае»[Мр 10, 14] празмернай турботай пра школу. Школа праходзіць, а жыццё, якім ёсць Ісус [Ян 14, 6], застаецца навечна. Можна ўзяць да штодзённага ўжывання караценькую малітву Сергія Раданежскага: «Боже, в помощь мою вонми, вразуми мя во учение сие». Гэты святы, па рысах яго дзяцінства, таксама быў «правапаўшарны», бо цяжка яму давалася навука школьная. Хлопец вераю перамог сваю тыпалогію праз адведанне сапраўднай навукі слова Божага. Думаю таксама, што трэба ўпэўнена ўлучаць ў прагрэсію адукацыі дачкі складаны, але высакародны шлях ад бессвядомага ці падсвядомага да лагічнага пасціжэння сэнсу быцця, ад інтуіцыі да рацыянальнага асэнсавання рэчаіснасці, ад уціслага настрою да радаснай перспектывы веры. Калі дзіця ў перадольванні вучэбнай сітуацыі будзе мець сталую падтрымку і пара-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ